Жыве Беларусь!

# Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№232 (745) 27-29 лістапада 1993 г. Субота-панядзелак. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 510223 экз. Кошт у розніцу — 25 руб.

## ФАКС

### Милосердие на один день?

**1 декабря объявлен в республике Днем инвалидов, которых в Беларуси, по последним данным, насчитывается около 360 тысяч.**

Как сообщили в республиканском комитете Красного Креста, за последние годы увеличилось количество инвалидов трудоспособного возраста. Естественно, что в связи с этим общество несет большой экономический ущерб.

**Андрей СЕРЕДА.**

### К вам едет ревизор!

**Совет Министров Республики Беларусь принял постановление о санкциях к предприятиям, нарушившим требования декларации денежных средств.**

Государственным налоговым инспекциям предоставлено право налагать крупный штраф за уклонение от декларации денежных средств по состоянию на 1 октября 1993 года, находящихся на счетах в банках за пределами Беларуси. Предприятия лишатся 50 процентов от суммы, на которую не была представлена декларация.

**Анатолий ВИТКОВСКИЙ.**

### С песнями и танцами. В безработные

**Под угрозой закрытия оказались десятки клубов, библиотек и спортивных сооружений Могилевщины, финансируемых профсоюзами.**

Только на ремонт и содержание этих учреждений, зарплату работников сегодня требуются сотни миллионов рублей в год, что уже не под силу ранее богатым профсоюзам. Если эти учреждения не будут финансироваться из бюджета области, то в ближайшее время прекратят свое существование.

**Николай АНДРЕЕВ.**

### Последняя — электричка

**Стоимость проезда в городском общественном транспорте, пригородных и междугородных автобусах останется на прежнем уровне по крайней мере до нового года.**

Об этом сообщили в Департаменте цен Госэкономплана Беларуси. Увеличатся лишь цены на проезд в электричках. На сколько — еще не решено. Пока же за проезд электричкой от Минска до Пухович пассажиры платят 140 рублей, в то время как в автобусе эта дорога стоила бы более 1600.

**Ирина СЕРЕГИНА.**

### К нам плывут деньги

**По договоренностям, которые заключила с соседними странами Литва, отсюда можно отсылать и здесь получать почтовыми переводами пенсию, алименты, социальные пособия и налоги.**

Перечисления делаются по актуальному курсу валют. Статистика свидетельствует, что из Литвы в Россию, Эстонию и Латвию высылают почти вдвое, а в Беларусь втрое больше денег, чем получают из этих стран.

**Андрей КОРСАК.**

### Спорт-экспресс

Выступающая на открытом чемпионате России по водному поло команда "Приор" из Минска во второй встрече сыграла вничью с волгоградским "Спартаком" — 6:6.

❑

Результаты матчей европейской Лиги чемпионов по футболу во второй группе: "Порто" — "Вердер" — 3:2, "Андерлехт" — "Мялан" — 0:0.

### Вкратце

**Германия лидирует среди стран дальнего зарубежья во внешнеторговом обороте нашей республики.**

Этот факт приводился на переговорах делегации министерств экономики и иностранных дел ФРГ с первым заместителем Председателя Совета Министров Беларуси Михаилом Мясниковичем и первым заместителем председателя Государственного комитета республики по внешним экономическим связям Михаилом Маринич.

❑

**Впервые официально собрались представители Министерства образования Беларуси и ректоры 16 негосударственных учебных заведений республики.**

Ректоры высказали неудовлетворенность: все нормативные документы и акты разрабатываются только Министерством образования республики, хотя касаются и негосударственных высших учебных заведений. По мнению большинства из них, такая работа требует совместных усилий.

❑

**В Министерство юстиции Беларуси поданы документы на регистрацию Конгресса демократических профсоюзов.**

В него входят Свободный профсоюз и Белорусский независимый профсоюз.

❑

**В Новополоцке состоялся первый в городе аукцион по продаже объектов муниципальной собственности.**

Городской бюджет Новополоцка после проведения аукциона пополнился на полмиллиарда рублей. В декабре подобный аукцион планируется провести и в Полоцке.

❑

**Очередное заседание Совета безопасности России прошло в Кремле под председательством президента Бориса Ельцина.**

На нем рассматривался вопрос об урегулировании осетино-ингушского конфликта.

❑

**Российское отделение международной организации "Гринпис" поддержало акт парламента Финляндии, принявшего решение о прекращении переработки отработанного ядерного топлива с финской АЭС на комбинате "Маяк" в России.**

"Гринпис" России призвал правительства других стран, имеющих контракты на переработку ядерного топлива в России (Украина, Словакия, Венгрия, Казахстан), принять аналогичные решения.

❑

**От дальнейшего проведения общенациональной государственной лотереи, вызвавшей немалую бурю протеста в Индонезии, вчера отказалось правительство этой страны.**

Власти таким образом уступили давлению со стороны представителей мусульманского духовенства, считающего, что азартные игры противоречат исламу.

Рисунок Олега ПОПОВА.

### Москва златоглавая

**Московские власти подвели первые итоги действия в Москве особого режима пребывания граждан ближнего зарубежья.**

За первую декаду платные визы получили свыше 10 тысяч приезжих, почти половина из которых — гости из кавказского региона.

Между тем нарушителей тоже хватает. Их штрафы составили почти 50 миллионов рублей.

**Леонид ГЕРАСИМОВ.**

### Погода и здоровье

**27 ноября погода в Минске и области будет определяться полем повышенного атмосферного давления. Содержание кислорода в воздухе будет выше средних многолетних данных.**

Сегодня может ухудшиться самочувствие больных с сердечно-сосудистой патологией — как опережающая реакция на неблагоприятный в геофизическом плане день 28 ноября. Им рекомендуется регулярный прием лекарств, назначенных врачом, успокаивающих средств (настойки пиона и пустырника). Соблюдайте диету и предпочтите в этот день растительную пищу, а от курения и употребления спиртного лучше вообще отказаться.

**Антонина КАРОЗА,**
**научный сотрудник БелНИИ кардиологии.**

❑

Неблагоприятные по геофизическим факторам дни декабря
1, 5, 13, 19, 21, 27

(По данным лаборатории медико-экологических проблем, профилактики Института клинической и экспериментальной медицины Сибирского отделения АМН России.)

### "Деревянные" арестованы. Тенге на свободе

**Переход на национальную валюту в Казахстане осуществлен организованно, заявил премьер-министр республики.**

Около 58 миллиардов рублей конфисковано в Казахстане в ходе кампании по обмену российских денег на местную валюту. Эти деньги, по данным правоохранительных органов, воротилы теневой экономики из-за пределов Казахстана пытались сбыть в республике.

**Константин БОРОДИНОВ.**

### Не замычать бы от таких цен

**В тяжелом положении находятся хозяйства Несвижского района.**

Выручка за реализованную с начала года продукцию составила около 15,3 миллиарда рублей, а затраты за этот же период — около 20 миллиардов. Это результат неадекватного роста цен на сельскохозяйственную продукцию, с одной стороны, и технику, энергоносители, топливо, минеральные удобрения — с другой.

**Ян КОПЫЛЬСКИЙ.**

**Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН и РИД.**

# "Выйдя на пенсию, поневоле станешь мудрецом"

**Лилия НИКОЛАЕВА,**
**фото Сергея БРУШКО**

Они живут жизнь в любви и потому не разучились сострадать другим людям. Валентина Харитоновна — медсестра кардиологического отделения 3-й клинической больницы. По долгу службы спасает чужие сердца. Ульян Алексеевич, первый выпускник Минского суворовского училища, служил в армии, а после демобилизации стал первым помощником капитана и бороздил моря, добывал рыбу.

Но возраст списал на берег. "На якорь" сели в Минске, и беспокойная душа Ульяна Алексеевича Самусенко стала искать себе дело. Работая на заводе имени Орджоникидзе, теперь начальник охраны на заводе стройматериалов. Военная выправка и подтянутость не позволяют назвать его пенсионером. К тому же пенсии он не получает. Живут на зарплату и сострадают старым, немощным, с маленьким пособием.

Супругов Самусенко мучает один вопрос: почему государство оказалось неспособным защитить этих людей хорошим законом? И когда собирается в старом многое поменять? Предусмотреть все до конца ни в одном законе невозможно. Зато мудрая жизнь обнажит в нем все уязвимые места.

Судя по предложениям Ульяна Алексеевича, все просто. Основанием для пенсии пусть служит трудовой стаж, а не возраст. Человек сам будет решать, работать ему или отдыхать. Если здоров и желает трудиться долго, то пенсия временно не выплачивается. Но она обязательно должна обеспечить нормальную жизнь, а не заставлять бедствовать. Целесообразно установить законодательно предельный возраст по отраслям народного хозяйства и в системе управления. Исключить дискриминацию в отношении мужчин и женщин, ведь от разновесия мужского и женского начала все беды на земле. В других странах почему-то одинаковый возраст ухода на пенсию, у нас мужчин отправляют на пять лет позже, а статистика оголяет эту несправедливость. На пенсии мужчины живут в среднем 5,6 года, а женщины — 19,8. Это замечательно, что женщине как продолжательнице рода дарится такая долгая жизнь. Но как прекрасно было бы, если бы она доживала свой век в паре, как Валентина Харитоновна с Ульяном Алексеевичем.

В пенсионный фонд надо бы отчислять не 1, а 2 процента заработка. И не огулом в общий котел, а на специальный счет конкретного работника. Тогда он будет осознавать, что все в жизни лепится его руками. Беды, страдания, радости и обеспеченная старость — не на чьем-то, а только на его личном счету.

Ульян Алексеевич — эрудит, победитель многих телевикторин по самым разным областям знаний. Душа его по-прежнему жаждет путешествий и новизны. Но из ста семидесяти тысяч семейного дохода уже не выкроить на это. Даже на книги — и то с оглядкой. Одним словом, стареют, беднеют люди и мечтают о лучших временах.

❑ *Валентина и Ульян Самусенко.*

*На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь*

# У аўторак дэпутаты возьмуць у рукі праект Канстытуцыі

**Мікалай ГАЛКО**

Тым, хто кіруе дзяржаўным караблём, і тым, хто ім дапамагае, хацелася б даць бадзёрую каманду "Поўны наперад!" — але замест гэтага даводзіцца падаваць сігнал аб бедстве і заклікаць усіх да аўралу.

Што рабіць парламенту пасля таго, як пастанова аб выхадзе з крызісу прынята? Такое пытанне паўстала на ўчарашнім ранішнім пасяджэнні. Разглядаць бюджэт на будучы год немагчыма, да гэтага яшчэ не падрыхтавалася Планава-бюджэтная камісія. Няма фінансавага падмурку, значыць, няма сэнсу разглядаць шэраг эканамічных законапраектаў.

Усе памятаюць аб абяцанні Вярхоўнага Савета правесці датэрміновыя выбары, але старая Канстытуцыя ставіць шлагбаум на шляху новага выбарчага заканадаўства.

Выходзіць, трэба браць за праект новай Канстытуцыі. Воз, што і казаць, вельмі цяжкі, але ніхто, акрамя Вярхоўнага Савета, не пацягне яго ўгару. Першым выказаў рашучае меркаванне дэпутат Уладзімір Станкевіч. Логіка ягоных разважанняў такая: ёсць у свеце краіны, якія жывуць наогул без Канстытуцыі — і нядрэнна жывуць, таму і нашаму Вярхоўнаму Савету няма патрэбы гнаць "канстытуцыйных коней". Тым больш што няма спадзяванняў на яе прыняцце.

Станіслаў Шушкевіч такога погляду не падзяляе. І на гэты раз ён працытаваў некалькі сказаў з тэксту старога Асноўнага Закона аб сіле рэвалюцыі, аб велізарнай ролі кампартыі... Кіравацца супярэчлівай Канстытуцыяй нельга.

Пачатак палітычнай дыскусіі быў пакладзены — і яна адбылася. Генеральны пракурор Васіль Шаладонаў выказаў неўразуменне, чаму прафесійны юрыст Станкевіч выступае супраць работы над Канстытуцыяй. Яе адсутнасць вымушае марнаваць шмат часу на розныя палітычныя дыскусіі.

Міхаіл Мачуленка абвясціў, што ў Гомелі спынілася 14 прадпрыемстваў. Страшэнны крызіс патрабуе ад дэпутатаў раз'ехацца па акругах, каб хоць нечым супакоіць людзей. Сцяпан Пісарэвіч таксама настойваў на тыднёвым перапынку ў рабоце сесіі.

Мікалай Лакіюшын у чарговы раз паспрабаваў выкрыць падкопы апазіцыі. Маўляў, яна не хоча ўдзельнічаць у рабоце сесіі, ігнаруе распрацоўку дакументаў аб адказнасці дэпутатаў-прагульшчыкаў, таму і ладу няма.

Тым не менш большасць дэпутатаў настойвала на паслядоўнасці, на прыярытэце ўвагі да Канстытуцыі. Галасаваннем вырашана, што раніцай у аўторак пачнецца разгляд праекта Асноўнага Закона.

Учора прадоўжылася абмеркаванне законапраекта "Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі". Напярэдадні яго прадстаўлялі намеснік старшыні пастаяннай камісіі Анатоль Вярцінскі і міністр інфармацыі Анатоль Бутэвіч. У спэчках выступілі дэпутаты Ніл Гілевіч, які перасцерагаў, каб мноства прэтэнзій да сродкаў масавай інфармацыі дэпутаты не перанеслі на законапраект, дакумент у цэлым дэмакратычны і грунтоўны, Іван Авін, які гаварыў аб неабходнасці абараняць грамадзян ад умяшання прэсы ў іх асабістае жыццё. Шмат вельмі слушных прапаноў выказалі таксама дэпутаты Васіль Трафіменка, Сяргей Навумчык, Лявон Баршчэўскі.

Па сутнасці, ніхто не адмаўляў закону ў праве на існаванне, але першае галасаванне завяршылася "пшыкам", яно набрала толькі 168 галасоў.

Узнікла лёгкае замяшанне. Лагодная атмасфера пры абмеркаванні не адпавядала адмоўнаму выніку.

Да мікрафона падышоў Васіль Шаладонаў. У законе ёсць, сказаў Генеральны пракурор, шмат палажэнняў, якія, можа, нават крыху ўшчамляюць правы чалавека. Але ж без прававой асновы дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі будзе ствараць шэраг непрыемнасцей, будзе вымушаць многіх грамадзян хадзіць па судах. Шаладонаў заклікаў прыняць закон у першым чытанні, перагаласаваўшы яшчэ раз.

Ці то заклік пракурора падзейнічаў, ці то настойлівы званок, які запрашаў дэпутатаў заняць свае месцы, але ў другі раз вынік галасавання стаў лепшым — 194 дэпутаты былі "за".

Другому законапраекту ўчора не пашанцавала. Пытанне "Аб аўдытарскай дзейнасці" адкладзена.

Раздзел "Рознае" ўчора быў небагаты на выступаючых. Зянон Ломаць выкрываў ганебную з'яву "прыхватызацыі" ў Слуцку і запрашаў умяшацца Старшыню Савета Міністраў.

Аляксандр Апацкі засяродзіў увагу на гаротным існаванні гаспадарак, дзе маецца развітая жывёлагадоўля. Малайцы дэпутаты-аграрнікі, яны настойліва імкнуцца дастукацца да розуму і сэрцаў усіх, хто разумее, што значыць вёска для дзяржавы.

Адна з гарачых кулуарных тэм на сесіі — ліст генералаў Эдуарда Шыркоўскага і Уладзіміра Ягорава. Гарачая тэма час ад часу выплёскваецца і з трыбуны сесіі. Дэпутат Аляксандр Траццякоў старанна ганьбіў аўтараў ліста такімі выразамі, як "чувство брезгливости", "подыгрывание оппозиции БНФ", "отвратительный донос", "знать, много свободного времени у генералов"...

Адчуванне такое, што дэпутат Траццякоў задоўга да абмеркавання вельмі важнага пытання вырашыў выйграць першынство па моцы выразаў.

У гэтым кантэксце нялішне дадаць, што просьба групы журналістаў аб прэс-канферэнцыі з прэм'ер-міністрам Вячаславам Кебічам адхілена. "...На нашу думку, — паведамляе намеснік начальніка ўпраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязей Саўміна Уладзімір Скуратовіч, — у ёй няма вострай неабходнасці".

У журналістаў ёсць неабходнасць, у Саўміна няма. "Наша думка", як правіла, перамагае. Але ж жыццё ёсць жыццё, пабачым, як усё будзе развівацца далей.

*З лічбамі не жартуюць*

## Пакінем зарплату нашчадкам?

**Апублікаваны даныя Дзяржаўнага Камітэта Рэспублікі Беларусь па статыстыцы і аналізу аб сярэднямесячнай зарплаце рабочых і служачых у студзені—кастрычніку 1993 года, якая склала 41.329 рублёў і павялічылася ў параўнанні з гэтым жа перыядам мінулага года ў 11 разоў.**

Гэтыя сухія, на першы погляд, лічбы мы маглі б пакінуць сваім патомкам у якасці своеасаблівага летапісу нашага жыцця. Таму што з іх дапамогай яны змогуць знайсці вельмі цікавую для сябе інфармацыю і ўявіць, якімі прыярытэтамі кіраваліся на сваім зямным шляху іх папярэднікі.

Такім чынам, калі меркаваць па размеру заработнай платы, што выдзяляецца цяпер беларускай дзяржавай работнікам прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, то ў найбольшай пашане ў яе, прычым са значным адрывам ад усіх астатніх катэгорый працуючых, — банкаўскія служачыя. У студзені—кастрычніку 1993 года іх сярэднямесячная зарплата складала 71.789 рублёў (у кастрычніку — 148.965 рублёў). Другому месцу на гэтым "п'едэстале" могуць радавацца будаўнікі — у іх галіне атрымлівалі ў студзені—кастрычніку ў сярэднім 54.693 рублі (135.978 — у кастрычніку), а трэцяму — работнікі апарату органаў кіравання (46.961 і 103.027 рублёў адпаведна). Мала адстаюць ад іх тыя, хто займаецца матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем і збытам (за кожны з першых дзесяці месяцаў гэтага года яны атрымалі ў сярэднім 45.894 рублі, у кастрычніку — 111.788); хто працуе на транспарце (45.097 і 111.056 адпаведна), у прамысловасці (44.108 і 107.766), а таксама сувязісты (43.511 і 97.195).

Групу, якая ідзе за лідэрамі па размерах заработнай платы, можна заспакоіць толькі тым, што пасля яе яшчэ застаецца кампанія аўтсайдэраў. А ў "залатую сярэдзіну" трапілі: работнікі страхавання (39.140 рублёў — іх сярэднямесячная зарплата ў студзені—кастрычніку, 97.404 — у дзесятым месяцы), навукі і навуковага абслугоўвання (38.131 і 95.866), лясной гаспадаркі (37.004 і 79.862), жыллёва-камунальнай гаспадаркі (36.624 і 88.628), аховы здароўя (35.629 і 82.377), народнай адукацыі (34.292 і 77.480), гандлю і грамадскага харчавання (31.947 і 87.512), а таксама фізкультуры і спорту (31.254 і 72.302).

У "чорным спісе" ўладальнікаў самых мізэрных заработных плат у Беларусі пазнейшаму лічацца: работнікі культуры (у сярэднім 29.905 рублёў атрымалі яны ад дзяржавы на кожны месяц у студзені-кастрычніку бягучага года, а ў кастрычніку — 70.727 рублёў), мастацтва (28.904 і 72.716) і сельскай гаспадаркі, уключаючы калгасы (27.443 і 71.984). Самай жа нізкааплатнай катэгорыяй працуючых у народнай гаспадарцы нашай рэспублікі застаюцца тыя, хто адказвае за сацыяльнае забеспячэнне — такая вось горкая іронія лёсу: іх сярэднямесячная заработная плата ў студзені—кастрычніку бягучага года склала 23.582 рублі, у кастрычніку — 54.670. Выходзіць, калі меркаваць па ўзроўню аплаты працы, то іх паслугі цэняцца ў нашай краіне ў тры разы танней, чым работа самых высокааплатных банкаўскіх служачых.

Нашым нашчадкам будзе над чым задумацца, знаёмячыся з гэтымі лічбамі. Толькі чаму б нам не выканаць гэту місію самім?

**Белінфарм.**

*Эксперымент!*

# Дзеці любяць булачкі з... вітамінамі

**Толькі 17 працэнтаў маленькіх грамадзян беларускай сталіцы можна назваць абсалютна здаровымі. Ведаючы, што ўсяго ў Мінску пражывае 400 тысяч дзяцей, няцяжка падлічыць, колькі з іх пакутуюць ад розных захворванняў.**

Да такога несуцяшальнага заключэння прыйшлі арганізатары маніторынгу, які быў праведзены гарадскім эндаэкалагічным цэнтрам пры ўпраўленні аховы здароўя Мінгарвыканкама і пры навукова-даследчым Інстытуце радыяцыйнай медыцыны. Прадстаўнікі цэнтра правялі медыка-экалагічнае абследаванне 500 дзяцей 10—12 гадоў і падлеткаў 15—17 гадоў, якія жывуць у двух экалагічна кантрастных раёнах Мінска — Зялёным Лузе і Заводскім.

У выніку абследавання сямёра дзяцей былі шпіталізаваны з сур'ёзнымі захворваннямі, 12 чалавек з высокім узроўнем утрымання свінцу ў арганізме былі накіраваны на "ачыстку" ў Аксакаўшчыну, а 156 чалавек атрымалі аздараўленне ў санаторыі "Пралеска".

20 працэнтаў дзяцей, якія жывуць у Заводскім раёне, і 13 працэнтаў з Зялёнага Луга маюць павышанае ўтрыманне свінцу ў арганізме. Каля чвэрці ўсіх абследаваных пакутуюць ад дэфіцыту біялагічных мікраэлементаў, а 60 працэнтаў — ад павышанага ўтрымання ртуці ў мачы, прычым крыніца гэтага небяспечнага металу пакуль што не ўстаноўлена. Заводскі раён значна апярэджвае Зялёны Луг па ўзроўню дзіцячых захворванняў крыві. Але Зялёны Луг больш неспрыяльны для сардэчна-сасудзістай сістэмы дзяцей.

Толькі 10 працэнтаў з іх могуць пахваліцца, што не маюць дэфіцыту вітамінаў у арганізме. Кожнае трэцяе абследаванае дзіця недаатрымлівае адзін від вітамінаў, кожнае другое — два, прычым часцей за ўсё дзецям не хапае вітаміну групы В.

Асабліва ўстрывожыў медыкаў, якія прымалі ўдзел у медыка-экалагічнай экспертызе, той факт, што ў 2,4 працэнта маленькіх мінчан ёсць вузлы на шчытападобнай залозе — гэта ж лічыцца сімптомам перадракавага стану. Для параўнання: у заражаным Хойніцкім раёне такіх дзяцей 1,4 працэнта, а ў чыстым Браслаўскім — 0,1 працэнта (праўда, у кожным з гэтых раёнаў абследавана ў два разы больш дзяцей, чым у Мінску).

А больш за ўсё парадаваў удзельнікаў маніторынгу 12-гадовы жыхар Зялёнага Луга, які быў прызнаны зусім "чыстым" ад усіх захворванняў. Сярод паўтысячы абследаваных дзяцей ён аказаўся адзіным. Для таго, каб гэты маленькі чалавек не страціў сваё здароўе да паўналецця і каб яму склалі прыемную кампанію як мага больш дзяцей і дарослых, распрацавана медыка-экалагічная праграма, якая будзе дзейнічаць да 2000 года.

Арганізатары карыснага эксперымента прапаноўваюць усім, хто мае адносіны да аховы дзіцячага здароўя, пачаць з самых рэальных метадаў: правесці мерапрыемствы па вітамінізацыі школьнікаў у зімова-вясенні час і павышэнню імунітэту з дапамогай харчовых дабавак, забяспечыць пастаўку ў школы і дашкольныя ўстановы толькі ёдаванай солі. Нахай у кожнай булачцы на снеданне кожнага дзіцяці паявіцца гарошынка вітамінаў!

**Вераніка БЯГУН,**
**Белінфарм.**

Народная газета

*Гасцёўня*

**Вольга ГАЛУБОВІЧ:**

# “Веру, што настане час прафесіяналаў”

**Мы неаднойчы сустракаліся ў апошнія гады.**
**Гадоў пяць таму мне здавалася, што тагачасны супрацоўнік "Чырвонай змены" і "Настаўніцкай газеты" Вольга Галубовіч дасягнула сваёй вяршыні. Пасада загадчыцы аддзела, педагагічная адукацыя і даволі салідны журналісцкі вопыт дазвалялі ёй працаваць на добрым узроўні, а ўдалае сямейнае жыццё, здавалася, страхавала ад глабальных змяненняў лёсу.**

Потым былі першыя ў гісторыі тады яшчэ БССР альтэрнатыўныя выбары ў Вярхоўны Савет, і я без цені сумнення выкрасліла са спіса кандыдатаў маёй акругі двух Вольгіных канкурэнтаў, чым, як высветлілася, няхай на ёту, але наблізіла яе перамогу.

Прозвішча Галубовіч замільгала сярод спісаў апазіцыі ў Вярхоўным Савеце і ўрэшце стала ў мяне асацыіравацца з пастаяннай Камісіяй парламента па справах сям'і і моладзі.

Цяпер, у час сустрэчы, Вольга зноў здзівіла, расказаўшы, што сёння яна яшчэ і слухач Дыпламатычнай акадэміі ў Маскве.

**— Вольга, што прымушае цябе, здольную сказаць свае слова ў журналістыцы жанчыну, яшчэ нешта шукаць?**

— Я стала разумець: каб нешта змяняць вакол сябе, трэба не толькі пісаць, але і рабіць. І паспрабавала прыўзняць сваю "планку": згадзілася стаць кандыдатам ў дэпутаты ад Таварыства беларускай мовы. Дала сябе ўгаварыць сябрам, якія разумелі, што трэба нешта мяняць і што, як бы гэта бясхітрасна і банальна ні гучала... беспартыйная жанчына з вопытам зносін з людзьмі мае больш шансаў прайсці, чым яны.

Вопыт работы ў Вярхоўным Савеце дапамог зразумець: трэба не проста рабіць, а рабіць прафесіянальна. Таму з радасцю прыняла прапанову і рэкамендацыю Вярхоўнага Савета для паступлення ў акадэмію.

У Маскве я трапіла быццам у іншы свет: вельмі высокі інтэлектуальны ўзровень выкладчыкаў, выхаванасць, шчырае жаданне дапамагчы... Я атрымала магчымасць у кнігах збіраць крупінкі чужога вопыту. Пазнаёміўшыся з Тард'е, адкрыла для сябе новую Францыю, у якой ніколі не была, паспрабавала зразумець, чаму вядомае вольнасцю сваіх нораваў грамадства адчула неабходнасць вярнуцца да хрысціянства, успомніць сямейныя каштоўнасці. Адкрыла для сябе і Ота фон Бісмарка, які пакінуў след у гісторыі Германіі не толькі мячом і крывёй, але і сваёй палітычнай мудрасцю.

Некалі сустракалася з хлопцамі з Партызанскай рады БНФ — яны катэгарычна настроены на радыкальныя перамены. Так, і мне б хацелася поўнага суверэнітэту сваёй краіны. Аднак адным жаданнем не дабіцца суверэнітэту, і нам зараз неабходны добрыя эканамічныя зносіны з Расіяй. Безумоўна, гэта нас да нечага абавяжа — але ў імя будучай незалежнасці з гэтым можна змірыцца.

Цяперашні Вярхоўны Савет, лічу, складзе свае паўнамоцтвы датэрмінова. Людзі, якія ў яго ўвайшлі, безумоўна, нешта значаць на сваім працоўным месцы, але ж парламентарыю, акрамя ўсяго, трэба разумець грамадска-палітычныя ўмовы, якія складваюцца, і працаваць прафесіянальна.

Аднак, пэўна, пройдуць два скліканні, перш чым Вярхоўны Савет зможа працаваць прафесіянальна.

**— Ці значыць гэта, што ты нават не паспрабуеш застацца ў Вярхоўным Савеце на другі тэрмін?**

— Быць заканадаўцам прэстыжна, але дзяржава рыхтуе мяне да выканаўчай дзейнасці. Калі ўбачу асобу, дастойную ўвайсці ў новы парламент, буду дапамагаць ёй гэтак жа шчыра, як дапамагалі ў свой час мне.

Пакуль жа я сустракаю асоб у іншых абставінах. Мяне літаральна ашаламіла жонка Леха Валенсы пані Данута. Маці васьмярых дзяцей аказалася мудрай жанчынай, здольнай пераканаць самага агрэсіўнага апанента, растлумачыць сённяшнія палітычныя працэсы ў Польшчы, дапамагчы мужу ўжо сваёй прысутнасцю.

На асоб мне вельмі шанцуе ў Маскве. Ці магла я марыць, што былы пасол у Вялікабрытаніі Віктар Папоў, які асабіста ведае Маргарэт Тэтчэр, стане маім выкладчыкам?

**— Ці не перашкаджае набыццю прафесіяналізму сям'я?**

— Прызнаюся, што да Маргарэт Тэтчэр, якая заўсёды знаходзіла час адпрасаваць кашулі мужу, а ў час работы над законапраектамі сама гатавала калегам рамштэксы, мне далёка. Большую частку хатняй работы ўзяў на сябе муж, за што яму бясконца ўдзячная. Мы з ім аднадумцы, хаця часам, здаецца, я павінна яго раздражняць. Дзякуй, ён здолеў зразумець нават маё жаданне паехаць у Маскву, хаця сын зараз у "цяжкім" узросце, і вельмі хочацца быць побач...

**— Твая элегантнасць і фігура, якой можна пазайздросціць, прадыктаваны службовым становішчам? Дарэчы, дзе ты апранаешся?**

— Як і ўсе жанчыны — у магазінах, атэлье, крыху шыю сама. Таксама часам ламаю галаву над тым, што апрануць. Калі спатрэбілася ўдзельнічаць у сустрэчы прэзідэнта Фінляндыі Мауна Койвіста, з жахам успомніла, што ў мяне няма плашча. Была толькі непрыгожай для афіцыйных цырымоній джынсавая куртка...

**— Ты не рызыкнеш прадказаць сёння, кім і дзе будзеш гадоў праз пяць?**

— Ведаю толькі, што паспрабую падыходзіць да тагачаснай працы шчыра і прафесіянальна...

**Гутарку вяла Ірына ДЗЯРГАЧ.**

**Фота Сяргея ГРЫЦА.**

*Узнагароды*

## Наша міліцыя ўмее працаваць прафесійна

Трагічная падзея 8 кастрычніка 1993 года глыбока ўзрушыла ўсіх мінчан. У пад'ездзе дома па вул. Якубава была згвалтавана і забіта вучаніца трэцяга класа. У пошукі злачынцы ўключылася следчая група ў складзе начальніка аддзела ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС Мінскага гарвыканкама падпалкоўніка міліцыі Аляксандра Юльянавіча Ашмянскага, оперупаўнаважанага гэтага ўпраўлення маёра Юрыя Уладзіміравіча Брэчкі, старшага оперупаўнаважанага крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС Мінска маёра Андрэя Феліксавіча Ермалкевіча.

Ужо праз некалькі дзён асоба забойцы была выяўлена і знойдзены выкрывальныя доказы, а праз два тыдні пасля ўчынення злачынства ён быў арыштаваны ў Бягомлі Віцебскай вобласці.

Яшчэ адзін прыклад аператыўнай работы органаў міліцыі. 3 лістапада 1993 года ў Мінску ў сваёй кватэры па вул.Д.Сердзіча з нажавымі раненнямі ў шыю былі знойдзены трупы мінчанкі і яе чатырохгадовай дачкі. Следчую групу ўзначаліў намеснік начальніка ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС палкоўнік міліцыі Мікалай Іванавіч Лапацік. 10 лістапада на Прывакзальнай плошчы Мінска быў затрыманы падазроны ва ўчыненні злачынства.

За праяўленую мужнасць, прафесійныя якасці ў выкрыцці злачынстваў М.І.Лапацік, А.Ю.Ашмянскі, Ю.У.Брэчка, А.Ф.Ермалкевіч прадстаўлены Старшынёй Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В.Ф.Кебічам да персанальных матэрыяльных узнагарод ад 300 да 500 тысяч рублёў.

**Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь — Белінфарм.**

*Мы и мир*

## Пойдут реформы — “пойдут” и доллары

**Есть все основания надеяться на поступление в этом году в Республику Беларусь около 140 миллионов долларов под дефицит платежного баланса и проведение реформ. Такое заявление сделал на пресс-конференции Белорусского союза предпринимателей и арендаторов президент союза М.С.Кунявский.**

На пресс-конференции были подведены итоги первой консультационной встречи делегации нашей республики с представителями международных финансово-кредитных организаций и стран-доноров. В результате встречи, по сообщению М.С.Кунявского, мы имеем гарантии получить от Всемирного банка 120 млн. долларов и от Международного валютного фонда — 100 млн. долларов. Также 100 миллионов пообещали выделить Япония и 67, причем уже в конце этого года, — Италия.

Вместе с тем большинство стран-доноров не торопится с оказанием финансовой помощи Беларуси. Одна из причин, тормозящих денежные вливания, — неблагоприятная для иностранных инвестиций система налогообложения. Кроме того, следует отметить, что некоторые представители западных стран высказывали недоумение: "Раз вы подписали с Россией договор о единой денежной системе, почему обращаетесь за помощью к нам?" Позиция белорусской делегации состояла в том, что вопрос единой рублевой зоны конструктивно далеко не решен. "Рамочное" соглашение Кебича и Черномырдина — это скорее политическое заявление, и его следует рассматривать как зондаж, а не как документ, который механически реализуется.

Все же, пожалуй, главное нарекание в нашу сторону касалось медленных темпов экономической реформы, в частности процесса приватизации. Особенно жестко по этому поводу выступил представитель США, который заявил : "Мы станем оказывать финансовую помощь тогда, когда у вас пойдут реформы, а тратить деньги на консервацию командной системы мы не намерены". Остается добавить, что 200 миллионов долларов по линии программы "Стэндбай" наша республика получит только в случае введения национальной валюты и продажи с аукциона в частные руки 15 производственных объектов.

**Анатолий ВИТКОВСКИЙ.**

*Базарная жизнь*

## “Наш Ростов-папа перед минским рэкетом — просто мальчик...”

**Степан ПАВЛОВИЧ**

**Как казаки на Комаровке салом торговали**

Из всех товаров, предлагаемых неугомонной столичной Комаровкой населению, лично я всегда выделяю сало. Его внешний вид и цены говорят о состоянии экономики и жизни гораздо точнее разной статистики. А главное — нагляднее.

И вот уже давно замеченная беда: в торговых рядах с салом все больше представителей российского юга: из-под Ростова, Ставрополя, Новочеркасска...

На днях и подошел к казачкам насчет небольшого интервью о жизни и торговле.

— Фамилий не пиши, а про жизнь и торговлю салом расскажем, — ответили мне.

Начали с жизни.

— У нас в Ростове базар, конечно, побогаче насчет выпить-поесть. Мужики в крае еще те: и по пятеро свиней держат, и по десять. Со сбытом, значит, трудно. Вот и везем к вам. Выгодно даже перекупить. Мы со Степаном, например, строимся — нужен лес. А в Беларуси его можно купить. Ну вот взяли мы в Ростове тонну свинины по 800 рублей за кило и продаем белорусам.

**— И как торговля?**

— Да нормально. Очереди к нам каждый день были. Сало ж у нас — ого-го! Получше вашего. Да и цены мы держали разные — смотря по салу: и три тысячи, и пять, и шесть.

Но народ у вас, честно скажем, уже голодноватый. Подходит, глаза горят, слюнки текут, а купить не всякий может. На днях одной бабке отрезали кусок "за так" — руки бросилась целовать. Раньше белорусы, знаем, получше жили...

**— Ну, а что у нас хорошего заметно?**

— Да рэкет у вас, хлопцы, тут просто класс. Он, конечно, на базаре нужен — для порядка. Но таких крутых еще не встречали. Ну, возьмем наших, ростовских. Дань, конечно, снимают. Но по-человечески. Придут, кусок сала скажут отрезать — отрежешь. И все.

А у вас? Каждый день с нас брали по 80—120 тысяч. И салом тоже. Ну чистый грабеж!

**— В милицию обращались?**

— Да подходили к нам пару раз ребята. Допытывались, сколько с нас рэкет берет. Ну, мы и говорим — по сотне тысяч "снимают" каждодневно. Многовато...

**— А они что?**

— Да ничего. Пошепчутся и уйдут. Вообще-то мы не против рэкета — где его сейчас нету? Но ваши минские, по-нашему, просто дуреют с поборами. Инфляция что ли такая?

На этом казаки замолчали, деловито подхватили рюкзаки и заспешили на вокзал.

Насчет же того, приедут ли еще — очень сомневались. Намекали на Литву, Латвию и даже Украину — с салом там тоже напряженка, но с рэкетом уже как-то полегче.

*Споведзь чытача*

## Гэта ж так дбаюць пра нас...

Шаноўная "Народная газета"!

Хачу з тваіх старонак прынародна пакаяцца, бо нядаўна прадпрыняў наўмысную спробу зрабіць эканамічную дыверсію супраць Рэспублікі Беларусь. Такая вось справа адбылася. Мая маці некалькі гадоў таму пераехала жыць з Беларусі на Украіну. Апынулася, як кажуць, у бліжнім замежжы. З'ездзіць пабачыцца з ёй я магу толькі падчас летніх школьных вакацый і таму вырашыў пакарыстацца паслугамі Міністэрства сувязі — паслаць пасылку. Напакаваў таго-сяго, а паколькі дасылаў у асноўным цукар, то ў дэкларацыі (як у Эфіопію!) так і напісаў: "Цукар". Заплаціў без малога чатыры тысячы за перасылку і страхоўку — і пайшоў мой гасцінец!

Праз тыдзень запрашаюць у аддзяленне сувязі: аказалася, што мая пасылка назад вярнулася. А на дэкларацыі стаяў унушальны штамп гомельскай мытні: "Вывозить сахар из Республики Беларусь запрещено". Непрыемныя, прызнаюся, хвіліны перажыў я тады, крыху нават пабурчэў, але супакоіўся і вырашыў усё ж не адступацца ад свайго намеру. Паклаў у скрынку кавалак сала, масла, "здабыў" нядрэннай каўбасы, напісаў у дэкларацыі: "Прадукты" — і пайшла мая пасылачка на другі віток. Тыдзень прайшоў — усё спакойна. Ну, думаю, дайшоў мой падарунак да "замежжа". Ажно праз некалькі дзён прыгрымела яна зноў да мяне. На гэты раз пільнасць праявіла мінская мытня. На дэкларацыі стаяў не менш унушальны штамп: "Вывозить продукты из Республики Беларусь запрещено". У мяне і сківіца адвісла...

— І што сабе толькі ўрад думае? І што гэта за законы такія, што жалезную заслону ствараюць паміж людзьмі? Адным словам, можаце здагадацца, якім высокім стылем у гэты час дзякаваў я каму след за перасылку прадуктаў самому сабе за ўласны ж кошт! А потым мне неяк цюкнула ў галаву: што ж гэта я раблю? Каго ж гэта я кляну?

Той самы родны ўрад, які дзень і ноч клапоціцца аб тым, каб ніводная драбніца харчышак не трапіла ў рот каму-небудзь "не нашаму"? Светлы Божа, ды ім жа ніяка кланяцца трэба, што пра мяне думаюць-дбаюць, а я такі няўдзячны! Ну, навошта маці каўбаса? Ёй 80 гадоў, і шгучнымі зубамі яна тае каўбасы не ўкусіць. А цукар, гавораць, — белая смерць, ад яго крывяносныя сасуды псуюцца.

Бачыце, як добра ўсё атрымалася: і маці здаравейшая будзе, і мне самому больш застанецца. Паразважаў я так — і на душы палягчэла: і хачу праз "Народную газету" выказаць нашаму мудраму ўраду і бравым мытнікам глыбокую падзяку за тое, што далі мне ўрок высокай грамадзянскай свядомасці.

**З павагаю Юрый ГАЛОЎКІН.**

**P.S.** Дарэчы, цукар той я купляў у суседзяў-украінцаў. Яны прывозяць тавар машынамі і нават вагаў не ўстанаўліваюць, а гандлююць цэлымі кулямі.

А сала было літоўскае, бо дзякуючы памянёнай мудрасці нашага ўрада і яго ўжо не стала ў крамах.

*г.Вайкавыск.*

*Адным абзацам*

**Далёкая дарога да школы...**

**Пяць дзён не наведвалі заняткаў сорак вучняў старэйшых і малодшых класаў Брагінскага раёна.**

Дзецям было не пад сілу пераадольваць у марозныя дні далёкі шлях ад дому да школы.

Раней такіх праблем не існавала: дзяцей дастаўлялі ў класы транспартам гаспадарак. Цяпер жа з-за адсутнасці гаручага ўзнікаюць праблемы. Вось чаму пастаянныя пропускі заняткаў школьнікамі адзначаны ўжо і ў Рагачоўскім, Жлобінскім, Чачэрскім раёнах.

**Запрагайце, хлопцы, коней!**

**У Магілёве рэзка скарочаны гарадскія маршруты аўтобусаў.**

